<u>***Сцэнарый пастаноўкі***</u>

*Адна з дзяўчат выбягае і робіць выгляд, што нешта шукае. Выцягвае з-пад лавы запылены бубен. Б'ючы ў бубен, выходзіць.*

***Дзед*** *(седзячы за сталом).* Што ўсё корпаешся, старая, як маладая перад родамі, скора госці прыйдуць, а ў цябе на стале, што ў лысага на галаве.

***Бабка*** *(каля печы).* Ах, ты, хрыч стары, ах ты, порхаўка старая. Лепей бы дапамог, а то толькі мелеш, як тая мянташка!

***Дзед*** *(падыходзіць да яе).*Супакойся, старая, супакойся, прыгажунька ты мая, якая ж ты бабулька ў мяне хвігурная *(абдымае)*.

***Бабка.*** Ідзі ўжо адсюль, пень гнілы!

*У гэты час за дзвярыма чутны галасы моладзі.*

***Першы хлопец.*** Хлопцы, засталася апошняя хата. Зараз паглядзім, ці ўмее гэта гаспадыня гатаваць, гасцей частаваць. А можа, яна з тых, аб кім кажуць: "І шыла, і мыла, і прала, і ткала, а ўсё языком".

*Моладзь заходзіць у хату, вітаецца з гаспадарамі.*

***Першая дзяўчына.***Добры дзень вам у хату!

***Бабка.***Праходзьце, госцейкі, праходзьце, даражэнькія, сядайце, мацуйцеся.

***Другая дзяўчына.*** Ой, як смачна пахне блінамі, я бліны люблю з маслам.

***Другі хлопец.***А колькі ласункаў на стале! Ды і мы шмат чаго маем *(дастае з кішэні гарэлку).*

***Бабка.*** Так, чакалі вас, чакалі, ды на стол збіралі.

***Дзед.*** Мая бабка яшчэ звечара рыхтавалася, мяне ноччу па ваду пасылала, ледзь парток у цемры не згубіў!

***Бабка.*** Ранняя птушка дзюбу карэбіць, а позняя вочы працірае.

***Дзед*** *(да гасцей).* Ну, госцейкі даражэнькія, сядайце, частуйцеся.

***Першы хлопец.*** Чакай, гаспадар, рана яшчэ. Хлопцы, цягніце калодку, у нас яшчэ Тэкля замуж не пайшла!

*Два хлопцы прывязваюць калодку і пытаюцца ў яе:*

"Тэкля, чаму ж ты замуж не выйшла?"

***Першая дзяўчына.*** Прыходзілі да яе сваты, угаворвалі яе і так, і сяк, а яна ні ў якую. Чаму? Га? Панчоха, шкарпэтка разлезлая!



***Тэкля.*** Нагадала мне варажбітка, што першы муж будзе п'яніца, другі – гуляка, дык я хачу адразу за трэцяга пайсці. Ды толькі дзе ж яго ўзяць?

***Першая дзяўчына.*** А так табе і трэба! Навыбіралася!

Отрывок из масленичного обряда в исполнении учащихся

***Тэкля*** *(да хлопца).*Ну, хопіць ужо, адчапіся ад мяне. Прычапіўся як лісце ў лазні.

***Другі хлопец.*** Не хочаш калодку цягаць – давай выкуп.

***Тэкля.*** Ой, няма ў мяне чым адкупіцца. Ну здыміце, хлопцы, калодку.

***Першы хлопец.*** Калі так, адгадай загадку: "Што расцілі, збіралі ды на стол засцілалі?"

***Тэкля*** *(думае).* Ну, вы мне і загадку загадалі. Доўга думаць прыйдзецца. Хлопцы, мабыць, гэта абрус?

***Першы хлопец.*** Ну, вось, а казала, што доўга думаць.

***Другая дзяўчына.*** Гэй, дзяўчаты, хлопцы, давайце карагоды вадзіць!

*Усе дзейныя асобы інсцэніроўкі шумна выходзяць.*